ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.5 (3031) ● ЧАЦВЕР, 15 ЛЮТАГА, 2007

Ян Чжы і яго дзве краіны... **Стар. 2**

Адраджэнне ў старадаўнім стылі
У Віцебску аднаўляюць адразу некалькі старажытных храмаў **Стар. 3**

Палескі ляўша
Майстар Міхаіл Яршоў славіцца тым, што складае з падковак мініяцюрныя ўзоры на гусіных і курыных яйках **Стар. 4**

“Машына часу” вяртае ў блізкае мінулае

У Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва праходзіць выстава пад назвай “Back in USSR: партрэт на фоне эпохі”. Прыватныя калекцыянеры Аляксандр і Іна Радаевы выставілі работы савецкіх мастакоў 1930 – 1970-х гадоў, што выклікала сапраўдны ажыятаж сярод спецыялістаў і аматараў жывапісу.

Сустрэчы з творамі мастакоў на гэтай выставе даюць магчымасць прыгадаць адбітак часу

Вольга Карнеева

Выстава стала своеасаблівай “машынай часу”, пры дапамозе якой кожны з наведвальнікаў мог пабываць у савецкім мінулым. І не проста пабываць — адчуць сябе на месцы людзей, увекавечаных на партрэтах майстроў беларускага жывапісу, пра якіх некалі пісалі на першых старонках газет, прысвячалі ім “перадавыя” матэрыялы.

Простыя савецкія людзі — даяркі, сталявары, шахцёры, трактарысты, будаўнікі — гляджяць на нас з карцін Івана Ахрэмчыка, Віталія Цвірко, Фёдара Дарашэвіча, Яўгена Зайцава, Фёдара Бараноўскага... А побач — мужныя твары “Брыгадзіра бурыльшчыкаў братняй ГЭС”, “Зваршчыка МТЗ”, “Шахцёра Салігорска”, адлюстраваныя на карцінах Івана Стасевіча і Яўгена Красоўскага. Акрамя таго, на выставе прадстаўлены карціны ў жанры індустрыяльнага пейзажу. Адна з самых запамінальных — “Абуджанае Палессе” Валяр’яны Жаўток — уражвае панарамным паказам асушэння палескіх балотаў.

Цікавая гісторыя звязана з двума партрэтамі кампазітара Людмілы Шлег, якія напісаны ў адзін дзень бацькам і сынам — Яўгенам і Генрыхам Ціхановічамі. Шэранькае паліто, чырвоны берэцік… Людміла проста забегла ў майстэрню да знаёмых мастакоў... і засталася ў вобразе прыгожай дзяўчыны адразу на дзвюх карцінах!

Не менш каштоўны на выставе і эцюд “Маладыя будаўнікі Мінска”, што напісаны мастаком Уладзімірам Стальмашонкам у 1956 годзе. У Беларусі ён застаўся менавіта дзякуючы калекцыянерам Радаевым.

ВЕСТКІ

Кацярына Немагай

Тэлевізійны прарыў

Міжнароднаму спадарожнікаваму тэлеканалу «Беларусь-ТБ» споўнілася два гады. І дасягненні на гэтым рубяжы даволі значныя. Так, у канцы 2006 года ў шасці буйных расійскіх гарадах быў праведзены комплекс сацыялагічных даследаванняў. Іх вынікі сведчаць, што па тыднёваму ахопу аўдыторыі «Беларусь-ТБ» уваходзіць у топ-20 тэлеканалаў Расіі. Да дня нараджэння канал падрыхтаваў новае афармленне. Акрамя таго, у гэтым годзе плануецца перавесці «Беларусь-ТБ» на іншы спадарожнік — «Экспрэс-АМ22», што істотна павялічыць тэрыторыю вяшчання.

Міжнароднае прызнанне барда

Гродзенскі бард Віктар Шалкевіч атрымаў міжнародную ўзнагароду “Ордэн усмешкі”, якую яму прысудзілі польскія дзеці за прапаганду тэатральнага мастацтва. Віктар Шалкевіч з’яўляецца вядомым спеваком і акцёрам не толькі на Гродзеншчыне, але і ў Польшчы. Дарэчы, гэта ўжо не першы гродзенец, узнагароджаны “Ордэнам усмешкі”. Такі ж ордэн атрымаў і дырэктар Гродзенскага мясакамбіната Анатоль Грышук за сваю грамадскую дзейнасць...

Прайсці шляхам “з вараг у грэкі”

Шведскія тураператары зацікавіліся арганізацыяй экскурсій па Глыбоцкім раёне. Сёння ствараецца турыстычная інфраструктура ў раёне азёр Шо, Доўгае, Івесь. Тут жа, па геадэзічных вымярэннях, размешчаны геаграфічны цэнтр Еўропы. Маршрут па Глыбоцкім раёне будзе праходзіць у рамках праекту “Панарама Дзвіна/Даўгава”, які паўтарае знакаміты шлях “З вараг у грэкі”. Пілотны тур арганізатары праекту збіраюцца здзейсніць ужо летам. У маршрут будуць уключаныя старажытныя беларускія гарады Дзісна, Полацк, Віцебск.

Турынскія іспыты здадзены на “выдатна”

Рэкордную колькасць узнагарод заваявалі беларускія спартсмены-студэнты на 23-й зімовай Універсіядзе ў італьянскім Турыне — чатырнаццаць (восем залатых, дзве сярэбраныя і чатыры бронзавыя). У агульнакамандным медалёвым заліку наша краіна заняла чацвёртае месца. На мінулай Універсіядзе ў Інсбруку на рахунку беларусаў было ўсяго пяць узнагарод — без «золата».

Ян Чжы і яго дзве краіны…

Ірына Заяц

Ян Чжы — аспірант факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта — прыехаў з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Ён родам з цудоўнага горада Лаяна (роданачальніка кітайскай культуры), дзе расце двухколерная півоня — надзвычай рэдкая і каштоўная расліна.

Да аспірантуры Ян Чжы рыхтаваўся доўга. У 1994 годзе прыехаў у Беларусь, у 1995 паступіў на факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Пасля заканчэння БДУ вярнуўся ў Кітай.

"Толькі на радзіме я зразумеў, што ў сэрцы ўжо дзве родныя краіны. Беларусь была са мной і ў думках, і на словах: у Інтэрнэце я чытаў навіны з Беларусі, расказваў бацькам і сябрам пра традыцыі і гісторыю вашай краіны… І, безумоўна, марыў яшчэ раз прыехаць сюды. За шэсць гадоў вучобы ў мяне з'явілася шмат сяброў і знаёмых, з якімі я любіў пагуляць па Нямізе, у Батанічным садзе. Сумаваў і па вашай нацыянальнай кухні… Асабліва па драніках са смятанай і клёцках. Спрабаваў згатаваць іх у Кітаі, але не атрымалася. Абяцаў, што калі буду ў Беларусі зноў, то ў першую чаргу навучуся гатовіць гэтыя стравы".

І ў 2005 годзе Ян Чжы вырашае вярнуцца ў Беларусь. «Прыемна было зноў пачуць ад кітайскіх студэнтаў, якія вучацца ў БДУ, сказанае з гонарам слова "Бай-да". У перакладзе з кітайскай мовы гэта азначае "Беларускі універсітэт". У назву "Бай-да" мы ўкладваем паняцце, блізкае слову "Бей-да", што значыць "Бейдзін дасюэ". Менавіта так на нашай мове гучыць назва самага прэстыжнага універсітэта Кітая — Пекінскага".

Вось ужо другі год Ян Чжы вучыцца ў аспірантуры. Ён прымае актыўны ўдзел у навучальным працэсе на факультэце. У кафедральным зборніку змешчаны артыкул Ян Чжы «Стратэгічнае партнёрства XXI стагоддзя паміж Кітаем і Беларуссю".

У планах Ян Чжы — абарона кандыдацкай дысертацыі. Сам ён прызнаецца: "Беларусь — мая другая Радзіма, якая мяне гасцінна прыняла і шмат чаму навучыла".

Ян Чжы адчувае сябе ў Мінску, як дома

Падарунак для турыстаў

Алесь Жалкоўскі

Усё больш прывабным становіцца для турыстаў – айчынных і замежных – старажытны Навагрудак. Найчасцей сюды наведваюцца госці з Польшчы. Яны ў захапленні ад прыгажосці прынёманскай старонкі, яе гістарычнай і культурнай спадчыны. Але часта турысты адчуваліі недахоп друкаванай прадукцыі аб гэтых мясцінах. І вось сітуацыя змянілася: мясцовыя ўлады пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі, нядаўна выпусцілі цікавы па зместу і прыгожы па форме фотаальбом "Навагрудак".

У выданні змешчаны каляровыя і чорна-белыя здымкі фотамайстра Ігара Пешахонава-Міцкевіча. Фотаальбом дае ўяўленне аб багатым мінулым і сённяшнім дні тутэйшых мясцін. Асабліва ўражваюць помнікі гісторыі і культуры. Аб гэтым, дарэчы, гаварылася на прэзентацыі альбома, якая адбылася ў Доме-музеі Адама Міцкевіча. Тэксты ў згаданым выданні дадзены на беларускай, англійскай і польскай мовах. Словам, турысты своечасова атрымалі цудоўны падарунак.

Паэтычныя вобразы Саят-Навы

Вечар, прысвечаны 290-годдзю класіка армянскай паэзіі Саят-Навы, адбыўся ў Рэспубліканскім Доме дружбы. Цудоўная паэзія гэтага аўтара гучала на армянскай, беларускай, рускай і польскай мовах.

Як адзначыў паэт Сяргей Панізнік, творчая спадчына Саят-Навы заўсёда захоўвае актуальнасць. Яго лірыка напоўнена вобразнымі параўнаннямі. Беларускія студэнты здолелі перадаць прыгажосць армянскай паэзіі. У гэты вечар вершы Саят-Навы чыталі Віталь Дзячэнка, Вольга Каралёнак, Алена Аляксандрава, а таксама прадстаўніца армянскай дыяспары Ева Мірзаханян.

Навучанне набывае новыя рысы

У Беларускім дзяржаўным універсітэце плануецца ўвесці мадэль адукацыі, заснаваную на самастойнай працы студэнтаў

Валерыя Сіманава

Асноўны прынцып новай мадэлі — студэнт павінен вучыцца сам. Для пераходу да новай сістэмы навучання павінны быць створаны адпаведныя ўмовы. Гэта, у першую чаргу, як паведаміў рэктар Белдзяржуніверсітэта Васіль Стражаў, забеспячэнне навучэнцаў і выкладчыкаў сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі. Акрамя таго, значную ролю адыграе арганізацыя метадаў кантролю, паколькі без іх самастойная праца студэнтаў наўрад ці атрымаецца. Па словах рэктара, ва універсітэце створана ўласная сістэма самакіравання. У яе распрацоўцы прымалі ўдзел спецыялісты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, студэнты якога неаднаразова перамагалі ў чэмпіянатах свету па гэтых дысцыплінах.

Шанс для жыцця

У 2006 годзе беларускія медыкі правялі дваццаць аперацый па трансплантацыі ныркі. Дзесяць з іх зроблены пацыентам ад жывых роднасных донараў.

Юрый Анісімаў

Апошняя перасадка ныркі ад жывога донара была праведзена ў лістападзе мінулага года сумеснай брыгадай з удзелам беларускіх спецыялістаў і іх калег (хірурга-трансплантолага, анестэзіёлага і нефролага) з трансплантацыйнага нефралагічнага цэнтра універсітэцкай клінікі горада Оксфарда (Вялікабрытанія).

Па словах галоўнага хірурга Міністэрства аховы здароўя рэспублікі Івана Пікірэні, трансплантацыя з'яўляецца самым эфектыўным лячэннем нырачнай недастатковасці. Дзякуючы ёй хворыя могуць пасля поўнасцю рэабілітавацца ў нармальным жыцці і не быць "прывязанымі" да бальніцы. Акрамя гэтага, такія аперацыі дазваляюць эканоміць значную колькасць бюджэтных сродкаў.

Так, штогадовае лячэнне аднаго пацыента пры дапамозе перытаніяльнага дыялізу абыходзіцца дзяржаве прыкладна ў дзесяць тысяч долараў, гемадыялізу — больш за шэсць тысяч долараў. Трансплантацыя ж ныркі каштуе каля чатырох тысяч долараў.

Голас памяці

Данецкай абласной грамадскай арганізацыяй "Культурна-асветніцкае таварыства беларусаў "Нёман" выдадзена кніга "У памяці захоўваем..." У зборнік увайшлі ўспаміны беларусаў-ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія жывуць сёння ў Данецку і вобласці.

Тамара Шкурко

Асноўнае месца ў кнізе займаюць "Мае ўспаміны" ўраджэнца Магілёўшчыны палкоўніка запасу Віктара Вільчынскага. У трох раздзелах ("Дзяцінства", "Юнацтва", "Служу Савецкаму Саюзу") расказваецца пра нялёгкі жыццёвы шлях нашага суайчынніка, яго ўдзел у ваенных падзеях на тэрыторыі Расіі, Беларусі і Латвіі, пра вучобу ў Ваеннай акадэміі імя Фрунзе ў Маскве.

Даволі багата ілюстраваная кніга завяршаецца спісам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаных юбілейным медалём "60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў", што пражываюць на тэрыторыі Данецка і Данеччыны. У спісе названы 270 прозвішчаў.

Гэтая кніга, адрасаваная найперш моладзі, выйшла дзякуючы падтрымцы Данецкай абласной адміністрацыі і фірмы "Мэбля". Складанне, запіс і апрацоўка матэрыялаў належаць данецкім актывістам беларускай дыяспары Артуру Акушку і Соф'і Пасынкавай.

Адраджэнне ў старадаўнім стылі

У Віцебску аднаўляюць адразу некалькі старажытных храмаў

Віктар Корбут

Кажуць сведкі: калі ў 1961 годзе ў Віцебску руйнавалі цудам уцалелую ў гады вайны старажытную царкву Звеставання (XII стагоддзе), у якой некалі маліліся рускі палкаводзец Аляксандр Неўскі і літоўскі вялікі князь Альгерд, паратунак неспадзявана прыйшоў з Масквы. Кіначасопіс "Фитиль" паўшчуваў зацятых бязбожнікаў, і помнік пакінулі ў спакоі. Царква гэтая ў канцы XX стагоддзя стала першай, што была адноўлена ў горадзе над Дзвіною за гады незалежнасці Беларусі. А цяпер тут адбудоўваюць яшчэ два храмы XVIII стагоддзя. Горад мяняецца на вачах: узносяцца барочныя вежы, ззяюць золатам купалы і крыжы. Сапраўднае адраджэнне!

На пачатку 80-х Генадзь Лаўрэцкі, цяпер вядомы архітэктар і даследчык айчыннага дойлідства, старшыня архітэктурна-мастацкага савета Беларускага Экзархата, марыў адбудаваць з руін царкву Звеставання. На той час ягоная ідэя многім здавалася "дзёрзкаю задумаю". Аднак Лаўрэцкі верыў, што яна калісь абавязкова спраўдзіцца.

Насталі 90-я, калі верыць у Бога ўжо не забаранялі ніякія "ўстаноўкі" і можна было адкрыта загаварыць і аб аднаўленні храмаў розных канфесій. Царква XII стагоддзя ў Віцебску стала адной з першых, куды прыйшлі рэстаўратары.

— Пасля таго, як маскоўскія кіношнікі з «Фитиля» паказалі сюжэт пра знішчэнне шэдэўра старажытнабеларускага дойлідства, гарадскія ўлады толькі праз некалькі гадоў закансервавалі рэшткі царквы. Пасля яны ўсё адно стаялі занядбаныя. Ахоўную шыльду не раз зрывалі нейкія злачынцы, і, сорамна сказаць, унутры ўсё было засмечана, колішні алтар ператварыўся ў прыбіральню, — расказвае пра незайздросны лёс святога месца ў 70-80-я гады Генадзь Аляксандравіч.



Яшчэ не канчаткова адноўленая Уваскрасенская царква ўжо ззяе купаламі над Віцебскам

Усё гэта давялося маладому архітэктару бачыць на свае вочы. На руінах царквы папрацавалі археолагі, а таксама мясцовыя краязнаўцы. У аднаго з іх былі фрагменты фрэсак, што пакрывалі некалі ўсе сцены царквы. Пасля выбуху яны змяшаліся з друзам і толькі выпадковыя кавалачкі трапілі ў рукі энтузіяста. На жаль, чалавек гэты, са словаў Лаўрэцкага, памёр, не пакінуўшы запавету: дзе шукаць яго калекцыю…

Адноўленая ў 90-я гады царква Звеставання цяпер размалявана сучаснымі мастакамі. Праўда, Генадзь Лаўрэцкі, які перамог скептычна настроеных калег і дамогся аднаўлення храма паводле свайго, вынашанага і не раз удасканаленага за два дзесяцігоддзя праекта, што да фрэсак — не дужа рады. Кажа, не варта было так «шчыраваць» у інтэр'еры. Цяперашняя ўнутраная аздоба царквы крыху дысгармануе з яе старажытнымі мурамі…

> Захавалася паданне, што сам Напалеон хацеў забраць да сябе ў Парыж гэтую красуню разам з віленскім касцёлам Святой Ганны.

Царква Звеставання стаіць на плошчы 1000-годдзя Віцебска. Гэта папулярнае месца ў гараджан. А тым часам на іншай плошчы, перад ратушай, высяцца вежы яшчэ адной царквы, адноўленай ужо ў XXI стагоддзі — Уваскрасенскай.

"Як гіганты, стаяць яны між будынкамі. Фасады італьянскай архітэктуры, грэчаскі стыль змяшаны з гатычным. Дужа мне гэта падабаецца, не магу нацешыцца", — прызнаваўся адзін з расійскіх падарожнікаў, які наведаў Віцебск напачатку XIX стагоддзя. Тады амаль тры дзесяткі храмаў ззялі купаламі над Дзвіною…

Цяпер уся колішняя веліч і краса вяртаецца, хоць і павольна, "у будучыню". 70 гадоў таму не стала "Уваскрасенкі", як празвалі яе ў народзе. Яна займала невялікі лапік зямлі ў Старым горадзе — мабыць, таму нічога на тым месцы пазней не паўстала. Археолагі лёгка адкапалі старыя падмуркі, і новыя сцены старой святыні сталі паціху ўваскрашацца…

Цяпер ужо не ратуша, а царква стала дамінантай гэтай часткі горада. "Самай вытанчанай лічаць яе знаўцы гісторыі беларускага дойлідства", — кажа Ігар Чарняўскі, намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры.

Захавалася паданне, што сам Напалеон хацеў забраць да сябе ў Парыж гэтую красуню разам з віленскім касцёлам Святой Ганны.

— Цяпер Уваскрасенскую царкву засталося толькі атынкаваць, — паведаміў Уладзімір Полаўцаў, дырэктар Віцебскага цэнтра па рэстаўрацыі. — Амаль на сорак метраў у вышыню ўздымаюцца крыжы над пазалочанымі макаўкамі царкоўных вежаў. Над высокім дахам усталявалі невялікую дэкаратыўную вежачку, а ўнутры пад ёю будзе купал, аздоблены вітражамі. Калісьці царква была грэка-каталіцкая, і цяпер у ёй спалучацца элементы заходняй і ўсходняй традыцый дойлідства.

Кардынальныя змены ў абліччы Старога Віцебска яшчэ наперадзе. Усе чакаюць, калі на стромкім пагорку над Дзвіной, у так званым Узгор'і, адродзіцца Успенскі сабор. Яшчэ ў 1998 годзе Патрыярх Маскоўскі і Усяе Русі Алексій II заклаў капсулу з пасланнем нашчадкам у падмурак будучай царквы, разбуранай у атэістычным 1936 годзе.

— На жаль, хаця зруйнаваць храм аказалася нескладана, аднаўляць яго будуць яшчэ гадоў пяць, не менш, — кажа Уладзімір Полаўцаў. — А яшчэ ж давядзецца многа зрабіць унутры царквы, якая, здаецца, самая вялікая ў Беларусі. Яе стваральнік, італьянец Фантані, будаваў сабор паўстагоддзя — за гэты час эпоха Рэчы Паспалітай паспела змяніцца панаваннем Расійскай імперыі, а барока саступіла папулярнасць класіцызму…

У Віцебску ёсць яшчэ што адраджаць. Чакае, калі падступяцца да яго падмуркаў, касцёл Святога Антонія Падуанскага. Не стала яго ўжо пасля Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер на месцы храма — фантан з русалкамі… А калісьці касцёл уразіў рускага класіка Івана Буніна: «Так узрушылі мяне яго арганы. Мне здалося тады, што няма на зямлі чароўнейшых за гэтыя раскаты, гул і громы гукаў, сярод якіх і наперакор якім ўрачыста пяюць у раскрытых нябёсах анёльскія галасы…»

Усяслаў Чарадзей вяртаецца ў Полацк

Павел Гаспадыніч

У Полацку сёлета будзе ўстаноўлены помнік князю Усяславу Чарадзею — славутай гістарычнай асобе, амаль міфічнай, пакрытай мноствам дасюль яшчэ не разгаданых таямніц і ўсемагчымых легендаў. Адна з іх, напрыклад, сцвярджае, што Усяслаў быў Чарадзеем з-за сваіх здольнасцяў ператварацца ў ваўкалака і адначасовага знаходжання ў некалькіх месцах.

Але пры гэтым полацкі князь быў таленавітым палкаводцам і дзяржаўным дзеячам. Менавіта ў часы яго кіравання — з 1044 па 1101 гады — Полацкае княства дасягнула найвышэйшага росквіту і магутнасці. І пры яго непасрэдным удзеле адбылася вядомая бітва на Нямізе. Дарэчы, Сафійскі сабор, вядомы далёка па-за межамі нашай краіны, быў пабудаваны таксама ў часы княжання Усяслава Чарадзея. Што ж датычыцца помніка, то ён будзе створаны з бронзы ў выглядзе конніка вышынёй 3,5 метра і размесціцца ў гістарычным квартале горада, каля Чырвонага моста.

Адкрыццё помніка прымеркавана да 1045-годдзя з дня заснавання Полацка. Надпіс на ім будзе зроблены на двух мовах — стараславянскай і сучаснай беларускай. Помнік Усяславу Чарадзею будзе адным з першых у Беларусі конных манументаў гістарычным асобам.

У рэстаўратараў ёсць ідэя

Кацярына Немагай

Зрабіць Палацава-паркавы ансамбль Румянцавых-Паскевічаў сапраўднай жамчужынай рэгіёна, прывабнай для турыстаў, — вось мэта праекта рэстаўрацыі гомельскага парку імя Луначарскага, дзе знаходзіцца і сам палац. Па ідэі рэстаўратараў, да 2010 года парк павінен змяніцца і паўстаць перад жыхарамі і гасцямі горада ў абліччы эпохі XVIII-XIX стагоддзяў.

У плане рэканструкцыі — замена ўваходных варот і агароджаў на стылізаваныя пад мінулае, усталяванне новых атракцыёнаў, кладка пліткі на дарожках парку, "пашпартызацыя" дрэваў, што захаваліся з ранейшых часоў.

Кацярына Іванчыкава:

“Веру ў сваю зорку”

Юлія Карчміт

Хваляванне, першыя крокі да поспеху, пастаяннае самаўдасканаленне, бясконцыя рэпетыцыі і канцэрты, знаёмства з новымі людзьмі... Менавіта такім стала жыццё Кацярыны Іванчыкавай, фіналісткі першага ў Беларусі шоу-праекта “Зорны дыліжанс”.

А пачалося ўсё з таго, што пяцігадовая дзяўчынка з маленькага гарадка Чавусы заняла першае месца на раённым музычным конкурсе. Пасля гэтай перамогі яна ўдзельнічала ў розных мерапрыемствах, якія праводзіліся ў школе, горадзе, раёне, рэспубліцы. Назіраючы за шматлікімі тэлевізійнымі конкурсамі, Каця была ўпэўнена, што таксама можа дасягнуць поспеху. Аднойчы яе мара здзейснілася. Чым зараз займаецца і якія планы ў надзеі беларускай эстрады, мы даведаліся ў самой Кацярыны Іванчыкавай.

— Каця, што цябе падштурхнула прыняць удзел у “Зорным дыліжансе”?

— Я вельмі хацела з’явіцца на тэлебачанні, таму шукала розныя тэлевізійныя конкурсы. Гэта займала шмат часу, трэба было мець цярпенне. Калі пачула пра праект Настассі Ціхановіч — “Зорны дыліжанс”, — адразу зразумела, што гэта мой шанц. Прайшла адборачны тур, спадабалася журы, потым — гледачам беларускага тэлебачання, дайшла да фіналу. Так “зорны” праект стаў першай значнай прыступкай у маім музычным жыцці.

— Які ўплыў аказаў на цябе ўдзел у праекце?

— Калі я стала фіналісткай “Зорнага дыліжансу”, адчула пэўны рост у сваёй творчасці. Разам з тым,ведала, што не праявіла сябе на ўсе сто працэнтаў. Менавіта пасля конкурсу зразумела, што магу рабіць значна больш.

— Вядомай ты стала дзякуючы тэлебачанню?

— У пэўнай ступені. Не толькі тэлебачанне, але і радыё, друкаваныя сродкі масавай інфармацыі зрабілі маё прозвішча вядомым. У родным горадзе мяне ведаюць усе, хваляваліся за мяне, галасавалі. Вялікі дзякуй за гэта. Хапала выпадкаў і ў Мінску, калі мяне прыпынялі і проста казалі: “Вы — Каця Іванчыкава з “Зорнага дыліжансу”? Мы за вас галасуем”. Але жыццё зменлівае. Конкурс — усяго штуршок. Каб цябе не забылі, каб з’яўлялася больш прыхільнікаў, трэба ісці далей, стаць прафесіяналам. А гэта вялікі і складаны шлях. Рукі апускаць не збіраюся, даваду распачатую справу да канца.

— Чым займаешся зараз?

— Набіраюся вопыту, пішу песні, музыку, спяваю. Выступаем з канцэртамі “Зорнага дыліжансу” па ўсёй краіне, працуем на адкрытых пляцоўках. Яшчэ — я студэнтка завочнага аддзялення Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Максіма Танка. Факультэт беларускай філалогіі і журналістыкі выбрала невыпадкова: лічу, што прафесія журналіста цесна пераплятаецца з прафесіяй спевака, яны публічныя.

— Як бы ты хацела рэалізаваць сябе ў будучым?

— Зусім нядаўна мы выступалі з “Народным артыстам” на “Славянскім базары ў Віцебску”. Спадзяюся, што на гэтым фестывалі мяне заўважылі, палюбілі. А чытачам “Голасу Радзімы” я б хацела пажадаць заставацца ў душы дзецьмі, не пераставаць марыць. У дарослым жыцці на пярэднім плане заўсёды справы, а жаданні недзе на задворках. Ніколі не забывайце пра іх, верце ў сваю зорку, бо мары заўсёды здзяйсняюцца.

“Зорны дыліжанс” стаў першай значнай прыступкай у жыцці Кацярыны Іванчыкавай. Цяпер “зорная” студэнтка факультэта беларускай філалогіі і журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Танка выступае з канцэртамі па ўсёй краіне.

Кацярыну Іванчыкаву вабяць эксперыменты

Масток паміж культурамі

Віктар Раманаў

Прэзентацыя Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя прайшла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Беларусь стала трэцяй у СНД краінай (услед за Расіяй і Узбекістанам), дзе будзе дзейнічаць такога роду інстытут.

У ім будуць наладжвацца курсы і стажыроўкі па кітаязнаўству і ўсходазнаўству, распрацоўвацца школьныя праграмы выкладання кітайскай мовы ў нашай краіне. Акрамя таго, інстытут, як спадзяюцца яго стваральнікі, павінен будзе актывізаваць абмен паміж дзвюма краінамі інфармацыяй у сферы эканомікі і спрыяць устанаўленню больш шчыльным кантактам паміж прадпрыемствамі і фірмамі. Менавіта дзеля гэтага ў структуры інстытута створаны два цэнтры — лінгвакраіназнаўства, а таксама эканомікі і маркетынгу.

“Захаваная спадчына” ў Магілёве

Ірына Тугарына

У Магілёўскі абласным мастацкім музеі імя П. Масленікава адкрылася новая экспазіцыя “Захаваная спадчына”. Яна знаёміць наведвальнікаў з калекцыяй помнікаў культуры XVI-XVIII і пачатку XIX стагоддзяў.

Дырэктар музея Аляксандр Хахракоў адзначыў, што адкрыццё экспазіцыі з’яўляецца яшчэ адным крокам наперад па захаванню і ўзнаўленню культурнай спадчыны Беларусі, усведамленню яе значнасці і непаўторнасці.

Асновай экспазіцыі, якая, дарэчы, дзейнічае пастаянна, сталі унікальныя кампазіцыі манументальнага жывапісу XVIII стагоддзя з Бялыніцкага касцёла кармелітаў.

Вельмі цікавымі экспанатамі з’яўляюцца калекцыі скульптураў і іконаў XVII-XVIII стагоддзяў, а таксама кнігі магілёўскай тыпаграфіі XVII стагоддзя, гравюры якіх былі своеасаблівымі ўзорамі для іканапісцаў, разьбяроў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва.

Палескі ляўша

Майстар Міхаіл Яршоў славіцца тым, што складае з падковак мініяцюрныя ўзоры на гусіных і курыных яйках

Ды не проста ўзоры, а сапраўдныя творы мастацтва — такія, як карта роднай Беларусі з абрысамі ўсіх абласцей ці як Неўскі праспект паўночнай расійскай сталіцы. Усе малюнкі ствараюцца шляхам умацавання пяціміліметровых падковак да шкарлупіны яек яшчэ меншымі цвікамі, плешкі для якіх Міхаілу Яршову ўдаецца вырабіць толькі… зубамі! На малюнак карты Беларусі майстар з Калінкавіч Гомельскай вобласці патраціў больш года і каля сарака метраў дроту. А цвікоў для ўмацавання падковак — больш за 2500 штук!

Майстэрства палескага Ляўшы не засталося непрыкмечаным — ён са сваімі арыгінальнымі творамі занесены ў кнігу рэкордаў краін СНД і Балтыі “Дзіва”. Цяпер чарга за кнігай рэкордаў Гінеса.

Футбол пабагацеў на турнір

Павел Гаспадыніч

Сёлетняя вясна павінна стаць куды больш прывабнай для аматараў папулярнай гульні

З гэтага года да традыцыйных чэмпіяната і Кубка Беларусі па футболе, якія пачынаюцца ў красавіку, “далучаецца” Кубак Асацыяцыі “Беларуская Федэрацыя Футбола”, за які паспрачаюцца 14 каманд з вышэйшай лігі і дзве з першай. Пачнуцца спаборніцтвы 12 сакавіка. А фінальны матч павінен адбыцца 25 сакавіка. Неўзабаве, 15 красавіка, стартуе ўласна чэмпіянат краіны па футболе. Такім чынам, усе аматары гульні нумар адзін у свеце маюць быць задаволены — да першага свістка арбітра, які абвесціць пачатак афіцыйнага матча, засталося менш за месяц.

Цікава і тое, што ў 2008 годзе вышэйшую лігу чэмпіяната Беларусі па футболе будуць прадстаўляць 16 калектываў замест 14-ці ,як было ў папярэднія гады. У сувязі з гэтым распрацавана сістэма пераходаў камандаў з адной лігі ў другую: у чэмпіянаце 2007 года толькі адзін клуб, які зойме апошні радок у турнірнай табліцы, пакіне першы дывізіён. Затое з другога адразу тры каманды папоўняць эліту беларускага футбола.

Снег не перашкода для гульні

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288–12–80; факс: +375 17 288–12–80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290–60–11
E–mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб’ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 2000
Заказ: 185
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2007